ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 10 (872) | Чацвер, 26 мая 1994 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

**12-ГА МАЯ КАЛЕКТЫЎ НАШАГА УНІВЕРСІТЭТА З УДЗЕЛАМ ШМАТЛІКІХ ГАСЦЕЙ УРАЧЫСТА АДЗНАЧЫЎ СВОЙ 25-ГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ. З НАГОДЫ ГЭТАЙ ЗНАМЯНАЛЬНАЙ ПАДЗЕІ ДАСЛАНЫ САМЫЯ ЦЁПЛЫЯ ВІНШАВАННІ**

**На адрас універсітэта-юбіляра і на імя рэктара члена-карэспандэнта АНБ прафесара Л.А.Шамяткова прыйшлі віншаванні і тэлеграмы:**

### *ПАВАЖАНЫЯ, дарагія сябры!*

Сардэчна віншуем вас, калектыў вучоных, выкладчыкаў, студэнтаў, усіх супрацоўнікаў, выпускнікоў вядомай у нашай краіне і за яе межамі навучальнай установы са слаўным юбілеем -- 25-годдзем з дня заснавання.

Радасна ўсведамляць, што за гэты час універсітэт дасягнуў значных поспехаў у падрыхтоўцы педагагічных і навуковых кадраў -- носьбітаў сучаснай нацыянальнай школы, на якіх ускладзена адказная і ганаровая задача выхавання новага пакалення.

Асабліва хацелася б падкрэсліць, што многія поспехі, якімі справядліва ганарыцеся вы і ўся наша дзяржава, дасягнуты вамі ва ўмовах надзвычайных -- на шляхах пераадолення чарнобыльскай ядзернай аварыі, калі спатрэбілася мабілізацыя фізічных і душэўных сіл усіх вас, вашай мужнасці і самаахвярнасці.

У гэты ўрачысты дзень выказваем глыбокае і шчырае пачуццё ўдзячнасці за плён вашай педагагічнай і навуковай працы, і жадаем калектыву універсітэта новых творчых поспехаў у высакароднай дзейнасці, скіраванай на падрыхтоўку сейбітаў "разумнага, добрага, вечнага", на адраджэнне і дзяржаўнае станаўленне нашай роднай Беларусі, зычым усім вам добрага здароўя і шчасця ў жыцці.

**Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь**

*Сардэчна віншую калектыў супрацоўнікаў, навучэнцаў з юбілеем. Прыміце найлепшыя пажаданні, плённай працы на карысць роднай Беларусі, асабістага шчасця. Прыняць удзел ва ўрачыстасці не маю магчымасці. Шчыра дзякую за запрашэнне.*

**Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.Грыб.**

❖ ❖ ❖ ❖ ❖ ❖

*Сардэчна віншую выдатны калектыў універсітэта са слаўным юбілеем. Жадаю вялікіх поспехаў у падрыхтоўцы новых пакаленняў высокаадукаваных спецыялістаў. Плённай навуковай і педагагічнай дзейнасці на карысць незалежнай Беларусі, уздыму нацыянальнага адраджэння.*

**Віцэ-прэзідэнт АН Беларусі акадэмік Р.Г.Гарэцкі**

❖ ❖ ❖ ❖ ❖ ❖

*Дорогие мои юбиляры! Как быстро пролетело 25 лет от знаменательного дня открытия нашего университета. Для меня и всего Гомеля это одно из самых замечательных событий в развитии науки и культуры. От всего сердца поздравляю Вас. Желаю всем здоровья, счастья, успехов в развитии родного для всех нас университета. Глубоко сожалею о невозможности быть вместе с вами.*

**Академик Владимир Белый.**

❖ ❖ ❖ ❖ ❖ ❖

### *ДОРОГИЕ КОЛЛЕГИ!*

*Ректорат и объединенный профком Московского университета им.М.В.Ломоносова сердечно поздравляет коллектив Гомельского университета им.Ф.Скорины с юбилеем.*

*Желаем одному из ведущих высших учебных заведений и научных центров Беларуси успехов в подготовке высококвалифицированных специалистов.*

*Выражаем уверенность в дальнейшем укреплении дружбы и сотрудничества между нашими университетами.*

**Ректор МГУ В.А.Садовничий**
**Председатель ОПК МГУ И.Б.Котлобовский.**

❖ ❖ ❖ ❖ ❖ ❖

### *Уважаемый ректор Гомельского университета!*

*По случаю 25--летнего юбилейного торжества нашего братского Гомельского университета, от имени Ректора Китайского Столичного педагогического университета Лин Бэйли и всех наших преподавателей и студентов шлём Вам и через Вас всем преподавателям и студентам ГГУ самые сердечные поздравления и наилучшие пожелания.*

*Желаем Вашему университету развития и процветания, Вам лично -- больших успехов в работе и здоровья!*

*Сотрудничество между нашими университетами плодотворно: успешно осуществляется обмен преподавателями. Работа белорусских коллег в Столичном педагогическом университете ценится высоко.*

*Мы уверены в том, что отношения между нашими университетами получат дальнейшее развитие.*

**С уважением Генсекретарь СПУ Лю Лиминь.**

❖ ❖ ❖ ❖ ❖ ❖

*Университет Абердина шлет свои теплые поздравления Гомельскому государственному университету по случаю юбилея.*

*Между нашими городами и нашими университетами развивается широкое сотрудничество, и мне доставляет огромное удовольствие передать от университета Абердина и от себя лично поздравления и наилучшие пожелания Гомельскому государственному университету. Я уверен, что мы продолжим обмен студентами, обмен научными идеями и совместную работу в целях создания более совершенного мира для наших будущих поколений.*

**Ректор университета Абердина Дж.Максвел Ирвин.**

# НА ЮБІЛЕЙНЫХ УРАЧЫСТАСЦЯХ

Падрыхтоўка да гэтага дня была працяглай і руплівай. Давялося правесці вялікую работу, патраціць значныя сродкі. Інакш і быць не магло. Як-ніяк адзначаўся 25-гадовы юбілей універсітэта. Спачатку, 11 мая, адбылося пасяджэнне вучонага савета. Рэктар Л.А.Шамяткоў павіншаваў прысутных з надыходзячым святам, уручыў групе ўзнагароджаных выкладчыкаў і супрацоўнікаў Ганаровыя граматы абласнога Савета народных дэпутатаў і універсітэта.

Галоўная ўрачыстасць прыпала на 12 мая. Да 14 гадзін адноўленую актавую залу запоўнілі прадстаўнікі ўсіх структурных падраздзяленняў ГДУ, шматлікія госці.

Пасяджэнне, прысвечанае юбілею універсітэта, уступным словам адкрыў яго рэктар член-карэспандэнт АНБ Л.А.Шамяткоў. Леанід Аляксандравіч горача павіншаваў усіх прысутных са знамянальнай падзеяй у жыцці нашага калектыву, а затым выступіў з кароткім дакладам, у якім ахарактарызаваў той слаўны шлях, які прайшоў другі ў рэспубліцы універсітэт за чвэрць стагоддзя свайго існавання.

Затым пачаліся віншаванні юбіляра, уручэнні прывітальных адрасоў, памятных падарункаў, узнагарод. Першаму слова было прадстаўлена намесніку Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь І.М.Бамбізу. Пасля асабістага віншавання ён зачытаў прывітальны ліст калектыву універсітэта ад Прэзідыума Вярхоўнага Савета нашай рэспублікі.

Цёплыя словы ў адрас універсітэта, яго шматтысячнага калектыву выказалі старшыня Гомельскага аблвыканкома М.Р.Вайцянкоў, намеснік міністра адукацыі А.М.Гарнак, які таксама зачытаў віншавальную тэлеграму прэм'ер-міністра Беларусі В.Ф.Кебіча, старшыня Гомельскага гарвыканкома С.К.Гальдадэ, старшыня Цэнтральнага райвыканкома г.Гомеля У.У.Давідовіч, начальнік упраўлення адукацыі аблвыканкома Ф.Р.Забродскі.

Ад імя праваслаўнага духавенства выступіў архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх, які зачытаў адрасаваны на імя Л.А.Шамяткова віншавальны ліст мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсея Беларусі Філарэта.

Свае віншаванні і найлепшыя пажаданні калектыву універсітэта выказалі загадчык аддзела адукацыі гарвыканкома М.П.Засінец, старшыня аблспорткамітэта А.Ц.Барысюк, дырэктар завода пластмасавых вырабаў М.М.Фядосік, намеснік дырэктара Інстытута механікі металапалімерных сістэм АНБ В.М.Савіцкі, рэктар Полацкага дзяржуніверсітэта Э.М.Бабенка, прарэктар Беларускага дзяржуніверсітэта П.І.Брыгадзін, рэктар Мазырскага пединстытута У.А.Дударэнка, дырэктар Інстытута лесу АНБ В.А.Іпацьеў, галоўны ўрач паліклінікі N6 Ф.С.Роўба, старшыня абкома прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі У.Я.Курылаў, загадчык аддзела Скарынаўскага навукова-асветнага цэнтра У.М.Конан, старшыня аблсавета аб"яднаных прафсаюзаў В.С.Ахлесцін, намеснік дырэктара завода "Крышталь" А.І.Алейнік, рэктар БелДУТа П.С.Грунтоў, прарэктар Гомельскага політэхнічнага інстытута С.Б.Сарэла, намеснік дырэктара Інстытута фізікі АН Беларусі М.С.Казак. Калектыў універсітэта шчыра віншавалі з юбілеем дырэктар БелНДІнафта С.Д.Шыраеў, прарэктар Гомельскага мединстытута Б.К.Кузняцоў, прарэктар Гомельскага кааператыўнага інстытута В.Я.Астапоўскі, дырэктар універмага "Гомель" М.А.Гуршчанкоў, дырэктар прадпрыемства "Гомельэлектратранспарт" У.А.Захарчанка, дырэктар Рэчыцкага педагагічнага каледжа У.І.Рабенка, упраўляючы банкам знешнеэканамічнай дзейнасці М.К.Лясун, намеснік старшыні Чыгуначнага райвыканкома Л.Н.Букшанава, начальнік СПМК-148 А.Ц.Кураўлёў, галоўны інжынер ВА "Беларусьнафта" У.І.Балыкін, старшыня прафкома авіяпрадпрыемства М.У.Вараб"ёў, генеральны дырэктар ВА "Гідраўтаматыка" А.І.Піліпенка, старшыня Гомельскага сельскага райвыканкома В.І.Сокараў.

У час урачыстага пасяджэння зачытваліся паступіўшыя ў адрас юбіляра тэлеграмы. Акрамя апублікаваных на першай старонцы нашай газеты яны атрыманы з Акадэміі фізічнай культуры і спорту, Брэсцкага пединстытута, Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, Віцебскага тэхналагічнага інстытута, іншых навучальных устаноў і арганізацый.

У заключэнне адбыўся вялікі святочны канцэрт, у якім прынялі ўдзел лепшыя выканаўцы і калектывы мастацкай самадзейнасці універсітэта.

13 мая была праведзена рэспубліканская канферэнцыя "Рэгіянальныя асаблівасці моў, літаратур і фальклору", прысвечаная юбілею універсітэта.

**Б.ВАЛОДЗІН.**



На здымку: уручаюцца ўзнагароды Міністэрства адукацыі.

Фота У.Чысціка.



# ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАМІ !

**У сувязі з 25-годдзем утварэння Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны ўзнагароджаны:**

## ЗНАЧКОМ "ВЫДАТНІК АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ"

**АЛЕШКА** Сцяпан Фёдаравіч -- дацэнт кафедры хіміі;

**ЗАЙЦАЎ** Барыс Макаравіч -- дацэнт кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры;

**ЛІН** Дзмітрый Рыгоравіч -- загадчык кафедры агульнай фізікі;

**МАКСІМЕЙ** Іван Васільевіч -- загадчык кафедры матэматычных праблем кіравання;

**СЕЛЬКІН** Міхаіл Васільевіч -- першы прарэктар.

## ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**БАБЫНА** Уладзімір Піліпавіч -- загадчык кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці;

**БАННІКАВА** Людміла Сцяпанаўна -- загадчык кафедры англійскай мовы;

**ВАХРУШАЎ** Валянцін Аляксандравіч -- прафесар кафедры геаграфіі;

**ЕЎТУХОЎ** Уладзімір Дзмітрыевіч -- дацэнт кафедры беларускай мовы;

**КАРМАЗІН** Аляксандр Пятровіч -- прарэктар па кадрах і сацыяльна-бытавых пытаннях;

**КАСЦЮЧЭНКАВА** Валянціна Малахаўна -- дырэктар бібліятэкі;

**КУРАВА** Іраіда Антонаўна -- галоўны бухгалтар;

**МАКСІМЕНКА** Мікалай Васільевіч -- загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі;

**НАВУЧЫЦЕЛЬ** Міхаіл Веніямінавіч -- прафесар кафедры эканамічных тэорый;

**ПАПКОВА** Ніна Іванаўна -- начальнік вучэбнага аддзела;

**ПІНЧУК** Адам Пятровіч -- загадчык кафедры геафізікі;

**РАБЕНКА** Вячаслаў Віктаравіч -- загадчык кафедры нямецкай і французскай моў;

**САБАЛЕНКА** Уладзімір Мікалаевіч -- загадчык кафедры рускай літаратуры;

**СЕРДЗЮКОЎ** Анатоль Мікалаевіч -- прарэктар па навуковай рабоце;

**ФІЛІПЦОЎ** Уладзімір Фёдаравіч -- дацэнт кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў;

**ХАРЛАМАЎ** Іван Фёдаравіч -- загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі.

## ГРАМАТАЙ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**АКУЛІЧ** Мікалай Уладзіміравіч -- дацэнт кафедры эканомікі і сацыялогіі працы;

**БОГДЭЛЬ** Іван Іванавіч -- загадчык кафедры геаграфіі;

**ВАРАТНІЦКІ** Георгій Іванавіч -- старшыня прафкома выкладчыкаў і супрацоўнікаў;

**ДЗЯМЕНЦЬЕВА** Ляля Аляксандраўна -- загадчыца канцылярыі;

**КАЗЛОВА** Раіса Міхайлаўна -- прафесар кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства;

**ЛЫТКО** Аляксандр Аляксандравіч -- загадчык кафедры псіхалагічнай дыягностыкі і падрыхтоўкі да вучобы ў ВНУ;

**МАЛАХАЎ** Алег Аляксеевіч -- дацэнт кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю;

**МАНАХАЎ** Віктар Сцяпанавіч -- загадчык кафедры алгебры і геаметрыі;

**МЕЛЬНІЧЭНКА** Ігар Міхайлавіч -- прафесар кафедры агульнай фізікі;

**МЯТЛІЦКАЯ** Марыя Міхайлаўна -- сакратар-машыністка рэктарата;

**ПАЛЯКОЎ** Леў Якаўлевіч -- дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі;

**РУПІН** Віктар Міхайлавіч -- юрысконсульт;

**СВІРЫДЗЕНКА** Валянціна Рыгораўна -- дацэнт кафедры хіміі;

**СТАНКЕВІЧ** Аляксандра Аляксандраўна -- загадчык кафедры беларускай мовы;

**ТАЛКАЧОЎ** Васіль Іванавіч -- дацэнт кафедры заалогіі і аховы прыроды;

**ШТЭЙНЕР** Іван Фёдаравіч -- загадчык кафедры беларускай літаратуры;

**ЭНЦІН** Эдуард Мацвеевіч -- загадчык кафедры гісторыі Беларусі.

## ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ АБЛАСНОГА САВЕТА НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ

**КАЛУГІН** Аляксей Савельевіч -- прафесар кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін;

**САПЕГІН** Леанід Міхайлавіч -- загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін;

**ІВАНОЎ** Юрый Паўлавіч -- дацэнт кафедры геафізікі;

**СЕРБІН** Георгій Анатольевіч -- загадчык кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі;

**ЖОГЛА** Васіль Гаўрылавіч -- дацэнт кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі;

**КАРПЕЙ** Тамара Васільеўна -- загадчык кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю, дэкан эканамічнага факультэта;

**СТАРАВОЙТАЎ** Міхаіл Іванавіч -- дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, дэкан гісторыка-юрыдычнага факультэта;

**КАЛЯДА** Віктар Антонавіч -- загадчык кафедры фізічнага выхавання;

**НАРСКІН** Генадзь Іванавіч -- загадчык кафедры лячэбнай фізічнай культуры;

**КАЛМЫКОЎ** Уладзімір Мікалаевіч -- загадчык кафедры філасофіі;

**СЕМЯНЧУК** Уладзімір Мікалаевіч -- загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі;

**ГАЎРЫЛАЎ** Аляксандр Уладзіміравіч -- загадчык кафедры заалогіі і аховы прыроды;

**ЧАРТОК** Валянцін Дзмітрыевіч -- дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі.

## ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ГАРАДСКОГА САВЕТА НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ

**ЖАДАН** Міхаіл Іванавіч -- загадчык кафедры ВМ і праграміравання;

**МІРОНЕНКА** Уладзімір Іванавіч -- загадчык кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў;

**МАЛІНКОЎСКІ** Юрый Уладзіміравіч -- прафесар кафедры вышэйшай матэматыкі;

**МЯРЭЖА** Валерый Леанідавіч -- дацэнт кафедры матэматычных праблем кіравання;

**АЛЯШКЕВІЧ** Мікалай Іванавіч -- загадчык кафедры фізічнай метралогіі;

**БАГДАНАЎ** Міхаіл Іванавіч -- дацэнт кафедры эканамічнай інфарматыкі і АСК, нам. дэкана эканамічнага факультэта;

**ЛАЗУЧЭНКАВА** Людміла Сяргееўна -- дацэнт кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю;

**СКОРАВА** Аляўціна Аркадзьеўна -- дацэнт кафедры эканамічнай інфарматыкі і АСК;

**КОВАЛЬ** Уладзімір Іванавіч -- загадчык кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства;

**ЯЗЭПАВА** Тамара Ігнатаўна -- дацэнт кафедры гісторыі Беларусі;

**ГАРАНІН** Леў Мікалаевіч -- дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі;

**РУБАН** Анатоль Аляксеевіч -- загадчык кафедры гісторыі ўсходнеславянскіх народаў;

**КАЧАТКОЎ** Уладзімір Іванавіч -- загадчык кафедры палітычнай сацыялогіі;

**БАРАДЗІНА** Галіна Паўлаўна -- старшы выкладчык кафедры фізвыхавання;

**ГРЫШАЧКІН** Адольф Рыгоравіч -- старшы выкладчык кафедры фізвыхавання;

**ДЗЕГЦЯРОЎ** Сяргей Максімавіч -- старшы выкладчык кафедры фізвыхавання;

**ЛІСОЎСКІ** Венядзікт Венядзіктавіч -- старшы выкладчык кафедры фізвыхавання;

**МАРОЗАВА** Любоў Мяфодзьеўна -- старшы выкладчык кафедры фізвыхавання.

**(Працяг у наступным нумары)**

## ГДУ--25

# ДОМ НАШ РОДНЫ ...

*Х*утка бягуць гады... Здаецца зусім нядаўна я разам са студэнтамі, тады яшчэ зусім маладога эканамічнага факультэта Андрэем Ляшчынскім і Уладзіславам Наважылавым чытала ўзнёслыя вершы аб тым, як вырас, як папрыгажэў наш універсітэт за першы год свайго існавання, а з таго часу прайшло ўжо чвэрць стагоддзя.

Такі адрэзак часу для навучальнай установы -- гэта ўжо гісторыя, якая адлічваецца не толькі колькасцю выпускнікоў і іх працоўнымі дасягненнямі, не толькі колькасцю дактароў і кандыдатаў навук, новых кафедр, навуковых распрацовак, але і ўсімі тымі добрымі справамі, якімі заўсёды славіўся наш універсітэт.

Добра памятаю, як мы выязджалі ў час канікул ці ў выхадны дзень з канцэртамі і падарункамі да выхаванцаў камунарскай школы-інтэрната, як усе разам удзельнічалі ў суботніках, з якой адказнасцю рыхтаваліся да Тыдняў факультэта, якія цікавыя выпускалі насценныя газеты, як спаборнічалі за права быць лепшай групай, лепшым курсам. Вельмі добрым стымулам былі такія спаборніцтвы ў паляпшэнні вынікаў вучобы і выхаванні грамадзянскай адказнасці ў кожнага студэнта.

Небагатай была тады яшчэ матэрыяльная база, шмат схем, табліц, прыбораў рабілі самі выкладчыкі, студэнты, але ўжо тады мы верылі, што аб дасягненнях нашых хутка будуць ведаць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. І гэта стала цяпер рэальнасцю.

У час вучобы я шмат часу аддавала грамадскай рабоце, развіццю мастацкай самадзейнасці і з радасцю адзначаю, што добрыя нашы традыцыі захаваліся ў клубе самадзейнасці універсітэта і сёння.

Не магу не ўспомніць тых, чые імёны не раз называла, калі была вядучай канцэртных праграм ва універсітэце. Нікога не пакідалі абыякавымі песні ў выкананні В.Бадашкі, Г.Гадлеўскай, Л.Шамятковай, гарэзлівыя прыпеўкі, якія спявалі М.Цылькова і Н.Пашынская, музычныя п'есы інструментальнага ансамбля з удзелам Ю.Кляменцьева. Пазней на доўгі час кумірамі сталі Леанід Каханчык і яго "Радзімічы", слава аб творчасці якіх выйшла далёка за межы універсітэта.

Па-рознаму скаліся нашы лёсы, аднак любоў да мастацкай самадзейнасці засталася на ўсё жыццё.

Не магу не нагадаць аб першых студэнцкіх навуковых канферэнцыях, аб сустрэчах творчай моладзі, да якіх з вялікай увагай ставіўся рэктар універсітэта У.А.Белы. З лепшымі распрацоўкамі і рэфератамі нас запрашалі для ўдзелу ў маладзёжных праграмах абласнога тэлебачання, дзе не раз давялося выступаць разам са студэнтамі фізіка-матэматычнага факультэта А.Сінюком, А.Шубадзёравай і інш.

А колькі вершаў нарадзілася ў сценах універсітэта! Ніна Шклярава, Міхась Башлакоў, Таіса Цыганкова (Мельчанка), Віктар Ярац, Мікола Хамянкоў і многія іншыя свае крокі ў паэзію зрабілі ў студэнцкія гады, а зараз некаторыя маюць па некалькі выдадзеных паэтычных зборнікаў. Я з асаблівай цеплынёй успамінаю тых, хто разам са мной быў членам літаратурнага аб'яднання "Крынічка", якое дзейнічала пры універсітэце. Рэгулярна друкаваліся ў шматтыражнай газеце "Гомельскі універсітэт" вершы аўтара гэтых радкоў, В.Ярца, М.Башлакова, М.Хамянкова і інш.

Гады ідуць. Новыя імёны з'яўляюцца ў паэтычнай рубрыцы газеты, і я ад імя маіх аднагодкаў жадаю маладым талентам творчых поспехаў.

Зараз я працую ў СШ N 8 г.Гомеля. Настаўніца вышэйшай катэгорыі. На працягу вось ужо 10 гадоў узначальваю работу групы "Пошук". Падтрымліваю сувязь з ветэранамі 283 -й Гомельскай ордэна Суворава II ступені стралковай дывізіі, збіраю разам з вучнямі матэрыялы аб удзельніках вызвалення г.Гомеля і Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Другі напрамак нашага пошуку -- збіранне песень, паданняў аб родным краі, яго людзях, традыцыях, нацыянальных і самабытных рамёствах беларускага народа. Усё, што ведаю і ўмею рабіць, стараюся перадаць сваім вучням, а таксама студэнтам універсітэта, для якіх вяду заняткі па спецыялізацыі "Арганізацыя і методыка пазакласнай і пазашкольнай работы".

Разам са мной працуе шмат выпускнікоў ГДУ. Усе яны скончылі розныя факультэты ў розныя гады, але заўсёды добрым словам успамінаюць свае студэнцкія гады, выкладчыкаў, якія перадавалі ім свае веды і вопыт.

Хачу сказаць словы шчырай падзякі ўсім тым, хто вучыў нас, выпускнікоў біялагічнага факультэта 1971 года. Многіх з іх ужо, на жаль, няма сярод нас, але добрая памяць аб іх жыве ў нашых сэрцах.

*Хай не гасне ніколі святло,*
*што вяло нас сюды*
*кожнай раніцай.*
*Хай заўжды дабрынёй і цяплом*
*Сустракае сваіх выхаванцаў*
*Дом наш родны -- універсітэт!*
*Творчы почырк наш будзе такі,*
*Каб чытаўся ў розных краінах,*
*Каб пачэснае імя Скарыны*
*Горда нёс праз гады і вякі*
*Дом наш родны -- універсітэт!*

**Л.ПРЫШЧЭПАВА,** выпускніца біялагічнага факультэта ГДУ 1971 года, зараз **Л.ШЫЦІКАВА**, настаўніца.

## ПРЭМ'ЕРА КНІГІ

На філалагічным факультэце адбылася прэм'ера навуковай кнігі "Лексічны атлас беларускіх народных гаворак" (Першы том). На сустрэчы выступілі прафесар У.В.Анічэнка, загадчыца кафедры беларускай мовы А.А.Станкевіч, намеснік дэкана філалагічнага факультэта У.А.Бобрык.

У выступленнях вучоных шмат добрых слоў было выказана стваральнікам -- вучоным-дыялектолагам, якія шмат гадоў збіралі мясцовыя словы, запісвалі іх, а зараз змаглі падрыхтаваць гэтае ўнікальнае выданне -- скарбніцу нашай старажытнай мовы і культуры. Дарэчы, пэўны ўклад зрабілі таксама і выкладчыкі, і студэнты беларускага аддзялення філалагічнага факультэта. Вядома, што "Лексічны атлас беларускіх народных гаворак" будзе мець пяць тамоў. Першы том прысвечаны жывёльнаму і расліннаму свету. Зараз рыхтуецца да друку другі том Атласа, але на сённяшні дзень ёсць фінансавыя цяжкасці.

Аўтарскі калектыў укладальнікаў і Фонд фундаментальных даследаванняў рэспублікі будзе вельмі ўдзячны арганізацыям, установам, асобным грамадзянам, якія ахвяруюць грашовыя сродкі на адрас: 220072, Мінск, праспект Ф.Скарыны, 66, п.406 . Фонд фундаментальных даследаванняў Рэспублікі № 700514 (Лексічны атлас) у камерцыйным банку "Беларусь" г.Мінска, МФО 153001795, код 795.

**Л.КУЗЬМІЧ,** кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык кафедры беларускай мовы.



## ДА ПРЭЗІДЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ

# З ПРЫКІДКАЙ НА СВАЙГО КАНДЫДАТА

Так ужо атрымалася, што ў канцы красавіка-пачатку мая наш універсітэт прыцягваў увагу грамадскасці, жыхароў г.Гомеля не толькі ў сувязі са сваім 25-гадовым юбілеем. Ён стаў яшчэ і месцам, куды скіроўвалі свае позіркі прэтэндэнты на пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Не паспелі члены універсітэцкага калектыву, як кажуць, апамятацца ад сустрэчы з прэм"ер-міністрам В.Ф.Кебічам, ад яго шчодрых абяцанняў, як у ГДУ завітаў яго сапернік па перадвыбарнай барацьбе лідэр Партыі народнай згоды старшыня Маладзечанскага гарсавета Генадзь Карпенка.

На гэты раз актавая зала была ўжо не такой запоўненай, бо прыйшлі сюды тыя выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты, хто вызначыў для сябе, што аддасць за Г.Карпенку свой голас, калі той пройдзе ўсе этапы перадвыбарнага марафону і стане кандыдатам на высокую прэзідэнцкую пасаду. Яны маглі тут жа, у зале, паставіць свае подпісы ў яго падтрымку, якія збіралі члены ягонай ініцыятыўнай групы.

Былі ў зале і тыя, хто такі выбар для сябе яшчэ не зрабіў, але хацеў бліжэй пазнаёміцца з асноўнымі поглядамі Г.Карпенкі на палітычнае, сацыяльнае і эканамічнае становішча нашай рэспублікі і на магчымыя, на яго думку, шляхі вываду яе з глыбокага крызісу.

У шчырай і даверлівай абстаноўцы праходзіла сустрэча, і спрыяла гэтаму таксама тое, што Г.Карпенка гутарыў з аўдыторыяй не са сцэны, з высокай трыбуны, а непасрэдна ў зале, нават без мікрафона.

**Наш кар.**

## ІНТЭРВ'Ю

# НОВЫ ЧАС -- НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ

***4 чэрвеня 1994 г. у Мінску адбудзецца з'езд Саюза Моладзі Беларусі. У яго рабоце прыме ўдзел студэнт гісторыка-юрыдычнага факультэта нашага універсітэта Андрэй Гарбачоў, які з'яўляецца яго дэлегатам. З ім гутарыць пазаштатны карэспандэнт нашай газеты першакурсніца спецыяльнасці "Правазнаўства" Алена Кадол.***

**-- Андрэй, чым займаецца Саюз Моладзі Беларусі?**

-- СМБ -- гэта такая маладзёжная арганізацыя, якая стварае ўмовы для абароны правоў моладзі і яе ўсебаковага развіцця.

**-- Ты хочаш сказаць, што СМБ -- гэта новаяўлены ВЛКСМ?**

-- Не зусім так. Калі нагадаць падзеі жніўня 1991 года, пасля якіх была забаронена дзейнасць усіх камуністычных арганізацый, у тым ліку і камсамола, то людзі, якім неабыякавы лёс моладзі, вырашылі стварыць новую маладзёжную арганізацыю, якая і атрымала назву СМБ. Такім чынам, гэтая арганізацыя атрымала ў спадчыну ад ВЛКСМ, які распаўся, не толькі яго маёмасць, але і большасць яго задач, якія датычаць моладзі, г.зн. праграмныя мэты і Статут СМБ распрацоўваліся на базе Статута ВЛКСМ, але з умовай, што гэты саюз моладзі будзе чыста грамадскай арганізацыяй, якая не стане ўдзельнічаць у палітыцы так актыўна, як ранейшы камсамол.

**-- Чым гэта было выклікана?**

-- Гэта было зроблена для таго, каб арганізацыя, якая з'яўляецца буйнейшай у Беларусі, не атрымала такога ўдару, як камсамол у жніўні 1991 года.

**-- Што цяпер адбываецца з камсамолам? Ці змог ён акрыяць пасля "удару?" Ці існуе ён наогул?**

-- Цяпер камсамол з'яўляецца калектыўным членам СМБ і праводзіць актыўную работу з моладдзю, тым самым выяўляючы маладых людзей, якім не абыякавы лёс Рэспублікі Беларусь. У выніку гэтыя маладыя людзі пачынаюць актыўна цікавіцца палітычным жыццём рэспублікі і падтрымліваюць задачы Саюза. Цяпер Саюз актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці рэспублікі і падтрымлівае ідэі і погляды партыі Камуністаў Беларусі.

**-- А чаму ты стаў членам СМБ, а не ўступіў ў камсамол?**

-- У той час, работа камсамола з моладдзю практычна не праводзілася, і лічылася, што камсамола ўжо не існуе, таму я стаў членам СМБ. І я аб гэтым не шкадую, таму што гэтая арганізацыя дала мне шмат: я пазнаёміўся з цікавымі людзьмі, пашырыліся мае погляды ў грамадска-палітычным жыцці.

**-- Чым вы займаецеся акрамя таго, што забяспечваеце абарону правоў моладзі? Гэта ж робяць і іншыя грамадскія арганізацыі...**

-- Наша арганізацыя таксама выступае за фінансаванне маладзёжных праграм дзяржавай, падтрымлівае Беларускі рэспубліканскі піянерскі рух, які паспяхова развіваецца ў нашай рэспубліцы. Асаблівую ўвагу мы звяртаем на паляпшэнне матэрыяльна-бытавога становішча студэнтаў і выступаем у абарону інтарэсаў беларускай моладзі. Мы імкнемся да таго, каб маладыя людзі добра ведалі, цанілі і шанавалі гісторыю свайго народа.

**-- Чым канкрэтна займаюцца члены СМБ у нашым універсітэце?**

-- Мы рэгулярна арганізоўваем паездкі моладзі і дзяцей у рэспубліканскі лагер "Зубраня" і міжнародны дзіцяча-юнацкі цэнтр "Артэк", а таксама розныя маладзёжныя мерапрыемствы на рэспубліканскім узроўні. А нядаўна камітэт СМБ ГДУ на чале з Віктарам Леванцовым сфарміраваў летнія студэнцкія атрады праваднікоў пасажырскіх паяздоў. У планах камітэта СМБ намечана шмат, але гаварыць аб гэтым пакуль рана.

**-- Калі хто са студэнтаў ГДУ зацікавіцца вашай арганізацыяй і выкажа жаданне ўступіць у яе рады, куды ён можа звярнуцца?**

-- У камітэт СМБ ГДУ да яго сакратара Віктара Леванцова /галоўны корпус, п.1-16/ або да мяне асабіста.

## КАФЕДРА -- ЮБІЛЕЮ

25-годдзю ГДУ прысвячалася ўрачыстае пасяджэнне кафедры гісторыі Беларусі, якое адкрыў яе загадчык доктар гістарычных навук, прафесар Э.М.Энцін. На яго быў запрошаны першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкома А.А.Касцючэнка. Аляксей Аляксеевіч пазнаёміў выкладчыкаў кафедры, гасцей і студэнтаў з эканамічным, сацыяльным і палітычным становішчам у вобласці. Яму былі зададзены пытанні, якія таксама непасрэдна датычыліся і нашага універсітэта. У прыватнасці, чаму аблвыканком не дапамагае выкладчыкам, супрацоўнікам у справе арганізацыі аздараўлення іх дзяцей, у атрыманні гуманітарнай дапамогі ў сувязі з чарнобыльскай бядой. На ўсе пытанні былі дадзены станоўчыя адказы.

Супрацоўнікі Гомельскага краязнаўчага музея Наталля Іванаўна Захаранка, Ганна Васільеўна Кузьміч, Марыя Васільеўна Чухлеева расказалі пра гісторыю беларускага касцюма і прадэманстравалі некаторыя яго экспанаты, якія захоўваюцца ў музеі.

Калектыў кафедры запланаваў правядзенне цэлага шэрагу мерапрыемстваў, прымеркаваных да юбілею універсітэта, і ўсе іх выконвае. У інтэрнаце па вул.Савецкай, 83а была праведзена цікавая сустрэча з супрацоўнікам УУС Гомельскага аблвыканкома Аляксандрам Ігаравічам Самойленкам, які пазнаёміў студэнтаў з крымінальным становішчам у вобласці, прывёў прыклады жудасных злачынстваў, факты парушэння законнасці і сярод студэнтаў. Гутарка была вельмі карыснай. Студэнты выказалі пажаданне, каб такія сустрэчы праходзілі не ад выпадку да выпадку, а рэгулярна.

18 мая адбылося выязное пасяджэнне кафедры з настаўнікамі гісторыі школ г.Рагачова.

**Т.Язэпава,** дацэнт кафедры гісторыі Беларусі.

# ПАЭТЫЧНАЯ ГАСЦЁЎНЯ



Сёння на старонках нашай газеты -- новае паэтычнае імя: Тамара Краўчанка. Яна студэнтка 6-га курса завочнага факультэта ГДУ спецыяльнасці "Руская мова і літаратура".

Нарадзілася на Чарнігаўшчыне. Закончыла Чарнігаўскі радыёмеханічны тэхнікум, працуе выпрабальнікам у аддзеле тэхнічнага кантролю на Чарнігаўскім радыёпрыборным заводзе.

Т.Краўчанка -- удзельніца абласнога семінара маладых літаратараў 1990 г. у г.Чарнігаве. Друкавалася ў абласной прэсе.

◆ ◆ ◆

*Как умирающий от жажды*
*Воды б ценил глоточек каждый,*
*Так я клянусь любовь ценить.*
*И бережно несу сквозь чащу*
*С водою родниковой чашу,*
*Но ямы, буераки — чаще,*
*И рвётся нить,*
*Соединяющая с небом!*
*После наркоза просят пить,*
*Как я прошу.*
*Пустую чашу*
*жму к груди...*
*Отверженность, не приходи!*

*Но ты, приятельница, близко*
*И за руку берешь осклизлой*
*Рукой*
*и клонишь ниже, ниже —*
*К болотной жиже.*

◆ ◆ ◆

*Машины фарами плавят воздух.*
*Уже вечер, а жить не поздно...*
*Не поздно смеяться, не поздно*
*плакать.*
*Не нужно мир покрывать лаком,*
*Хотя он хуже подержанной вещи —*
*Столько царапин, сколов и трещин.*
*От слез ржавеют гвозди обид —*
*Все качается, все дрожит...*
*Но если вместо гвоздя улыбка,*
*Мир перестанет качаться зыбко.*
*Тогда иди в карнавал листопада,*
*Смеяться надо, смеяться надо!*
*Листья в руки — словно кимвалы,*
*Чтоб золото звуками смеха летало!*

◆ ◆ ◆

*Ни гуслей, ни свирели,*
*А скоро праздник.*
*Деревья присмирели,*
*Как перед казнью.*
*Им холодно. Скорее бы —*
*Листьев кокон!*
*Ни фонари не греют,*
*Ни свет из окон.*

# ЦІ БУДЗЕ Ў ГОМЕЛІ ЭЛІТАРНАЕ КІНО ?

Адпраўляючыся ў Мінск наведаць сяброў, я не думаў, што траплю на закрыццё рэтраспектывы фільмаў Райнера Вернера Фасбіндэра, самага яркага і, несумненна, самага прадуктыўнага рэжысёра "новага нямецкага кіно". Гэта ўнікальная падзея ў культурным жыцці нашай рэспублікі. Беларускі глядач атрымаў магчымасць пазнаёміцца з творчасцю практычна невядомага ў нас самабытнага нямецкага рэжысёра. Нягледзячы на тое, што яго фільмаграфію складаюць больш сарака назваў, у айчынным пракаце былі толькі два фільмы: "Смутак Веранікі Фос" /1981 г./ і вельмі пакрэмзанае цэнзурай "Замужжа Марыі Браун" /1978/. У мінулым годзе па тэлебачанні дэманстраваўся фільм "Лілі Марлен" /1980/.

У другую частку праграмы "Фасбіндэр: Лінія Жыцця", якая праходзіла з 18 па 30 красавіка ў будынку Белсаўпрофа, увайшлі такія фільмы як "Горкія слёзы Петры фон Кант", "Фантанэ Эфі Брыст", "Я хачу толькі, каб мяне любілі", "Кітайская рулетка", "Трэцяе пакаленне" і інш. Арганізатары гэтай акцыі, з якімі мне давялося пагутарыць перад сеансам, -- прэзідэнт беларускай федэрацыі "Кінаклуб" С.Г.Саўчык, дырэктар федэрацыі Г.Ф.Глік і дацэнт кафедры філасофіі БДУ М.Р.Жбанкоў -- расказалі аб тым, што копіі фільмаў на мове арыгінала былі прадстаўлены Інстытутам Гётэ пры непасрэдным удзеле яго кіраўніка Веры Пагаянц для аднаразовага паказу ў гарадах рэспублікі, дзе ёсць аддзяленні "Кінаклуба". У час дэманстрацыі фільмаў выкарыстоўваўся сінхронны пераклад, які рабілі студэнты Мінскага інстытута замежных моў.

Наконт фільма "Я хачу толькі, каб мяне любілі", які закрываў рэтраспектыву, сам Фасбіндэр неяк казаў: "Мы спрабуем зняць кадры, якія на першы погляд не ўяўляюць сабой нічога асаблівага, але калі паглядзець на іх яшчэ раз, то гледача ахоплівае жах. Жах -- не прыдуманы, а той, які ідзе ад рэчаіснасці". Гэтыя словы ў многім растлумачваюць творчае крэда рэжысёра, як, зрэшты, і тое, што фільмы, якія на 12 гадоў перажылі свайго стваральніка, і сёння не страцілі сваёй прыцягальнай актуальнасці.

У новай праграме "Жывапіс і кіно", падрыхтаванай беларускай федэрацыяй "Кінаклуб" сумесна з аддзелам культуры пасольства Францыі, якая прайшла ў кіназале Палаца культуры прафсаюзаў у сярэдзіне мая, былі прадстаўлены фільмы аб сучасных французскіх мастаках, фільмы з удзелам мастакоў, а таксама іх аўтарскія эксперыментальныя фільмы.

У канцы размовы кінаклубаўцы выказалі шкадаванне аб тым, што з усіх абласных гарадоў рэспублікі толькі Гомель і Магілёў не маюць сваіх клубаў аматараў элітарнага кіно, і прапанавалі арганізаваць пры Гомельскім універсітэце ініцыятыўную групу па стварэнню падобнага аб'яднання, з якім яны былі б рады супрацоўнічаць.

Тыя, хто зацікавіцца гэтай ідэяй /а варта было б/, могуць звязацца з беларускай федэрацыяй "Кінаклуб" па адрасу: г.Мінск, пр-т Ф.Скарыны, 25 (тэл. 27-59-29).

**В.БОРТНІК,**
студэнт 3-га курса
філалагічнага факультэта.



**З гісторыі гомельскага парку**

***Гомельскі парк... Сюды мы прыходзім і ў святы, і ў дні, калі душа хоча спачыць ад будзённасці і турбот, знайсці раўнавагу ў цішыні алей, у велічнай прыгажосці прыроды.***

***Але, згадзіцеся, не часта задумваемся мы, калі гуляем ў гэтым цудоўным куточку нашага горада, аб тым, што наш парк цікавы і сваёй багатай гісторыяй. Аб ёй нам дапаможа даведацца пяцікурсніца гісторыка-юрыдычнага факультэта Алена Бабовіч, якая прысвяціла гэтай тэме сваю дыпломную работу.***

# УНІКАЛЬНЫ ПОМНІК КУЛЬТУРЫ

Рэспубліка Беларусь мае багацейшую гісторыка-культурную спадчыну, значную частку якой складаюць помнікі дварцова-паркавага мастацтва. Захаванне яе як часткі ўсяго набытку чалавецтва з'яўляецца для кожнага народа крыніцай духоўнага ўзбагачэння, абавязковай умовай эстэтычных і маральных каштоўнасцей.

Што ж мы ведаем аб паркабудаўніцтве на тэрыторыі Беларусі і, у прыватнасці, аб нашым Гомельскім гарадскім парку, які мае паўтаравекавую гісторыю? Большасць людзей ведаюць, што парк наш старажытны, разумеюць і цэняць яго прыгажосць, але ... з пункту погляду сённяшняга дня. А якімі вачамі бачылі гэты ж парк сучаснікі яго закладкі і першых дзесяцігоддзяў развіцця? Якія каштоўнасці ён у сабе заключаў ва ўяўленні людзей XVIII-XIX стагоддзяў? На жаль, садова-паркавае мастацтва мінулага ў нас менш вядома, чым хацелася б, таму зробім невялікі экскурс ў яго гісторыю.

Першыя звесткі аб штучна ствараемых чалавекам садах дайшлі да нас з часоў Старажытнага Егіпта і Месапатаміі, дзякуючы розным археалагічным знаходкам, а "вісячыя" сады Вавілона нават лічыліся адным з сямі цудаў свету. Вядомы свяшчэнныя храмавыя сады, фруктовыя гаспадарчыя, лекавыя садзікі. Сады былі рознымі па размерах: ад вялізных дварцовых да невялікіх, упрыгожаных зелянінай участкаў у двары дома. Па прызначэнню яны служылі месцам для адпачынку, адзіноты, развлажанняў і для ўвесяленняў. У Старажытнай Грэцыі і Рыме акрамя прыватных садоў упершыню сталі разбівацца грамадскія гарадскія для ўсіх жыхароў.

Эпоха Сярэдневякоўя наклала свой адбітак на развіццё садова-паркавага мастацтва. Маленькі ўнутраны садзік з фантанам або сажалкай стаў абавязковай часткай манастыроў і набыў значэнне Эдема, раю. Акрамя дэкаратыўных, пры манастырах, а таксама замках, разводзіліся гаспадарчыя сады, агароды для кухні і аптэкарскія "траўнікі". За межамі замка часта ствараліся вялікія кветкавыя газонныя лугі для рыцарскіх турніраў і свецкіх забаў. Пазней замкавыя сады стануць служыць месцам спатканняў закаханых, адпачынку ад прыдворнай мітусні і шуму або, наадварот, для вясёлых гульняў, танцаў і іх назавуць "садамі асалоды, задавальнення, кахання". Больш разнастайнасці з'явіцца ў садовай раслінасці дзякуючы частым кантактам з Сярэднеземнамор'ем і Бліжнім Усходам.

Адраджэнне прымусіла людзей па-новаму зірнуць на адносіны чалавека і прыроды. Раней сцвярджалася, што прырода ёсць свет, створаны Богам, які вышэй за чалавека і падае яму прыклад праведнага жыцця. Грэшная чалавечая істота не мае права ўмешвацца ў амаль "райскую" прыроду. Цяпер чалавек стаў разглядацца як вышэйшае стварэнне Бога, як гаспадар зямнога свету, які можа пераўтвараць прыроду з дапамогай свайго розуму, падкрэсліваць лепшыя яе бакі. Прырода пераўтвараецца ў крыніцу задавальнення і радасці, а не толькі павучання і карыснасці. Можа менавіта таму з пачатку XVI ст. паркі і сады становяцца абавязковым атрыбутам жыцця свецкага грамадства. Сады і паркі італьянскага Адраджэння ўжо выходзяць з унутранага двара за агароджу вілы, палаца. Яны адрозніваюцца выразнай кампазіцыяй, вялікай колькасцю "зялёных" кабінетаў, лабірынтаў, пераходаў і алей.

Гомельскі паркавы ансамбль стварыўся ў перыяд Рамантызму /для яго быў характэрны пераход ад так званага французскага рэгулярнага стылю да англійскага пейзажнага, правобразам якога стаў прыродны ландшафт/ і з'яўляецца бліскучым узорам пейзажнага стылю. Па сваёй мастацкай завершанасці, якая выражаецца ў гарманічным спалучэнні ў адзіным ансамблі рэльефа мясцовасці, воднай прасторы, зялёных насаджэнняў і архітэктурных збудаванняў, ён стаіць у радзе лепшых узораў паркабудаўніцтва XIX ст. І, нарэшце, у комплексе з палацам і гістарычнай часткай горада парк уяўляе сабой адзіны ў Беларусі цэльны ансамбль, які захаваўся, і найбольш выдатны помнік рускага класіцызму.



Стварэнне такога ўнікальнага помніка культуры патрабавала значных матэрыяльных і людскіх рэсурсаў. Аднак, для ўладальнікаў гомельскай сядзібы гэта не ўяўляла асаблівых праблем, бо яна належала на працягу амаль 150 гадоў адным з першых асоб Расійскай імперыі, такім як фельдмаршал П.А.Румянцаў, яго сын, міністр замежных спраў і адначасова міністр камерцыі Н.П.Румянцаў і фельдмаршал І.Ф.Паскевіч, які выкупіў у 1834 годзе з казны былую румянцаўскую сядзібу. Справа ў тым, што па завяшчанню Н.П.Румянцава, які вельмі любіў Гомель і шмат зрабіў для яго добраўпарадкавання, маёнтак можна было прадаць толькі канцлеру або фельдмаршалу Расійскай дзяржавы і нікому болей, што і было зроблена. Усе гэтыя вядомыя ваенныя і палітычныя дзеячы маглі сабе дазволіць запрашаць на работу вядомых майстроў па стварэнню, добраўпарадкаванню палацаў і паркаў не толькі са сталіцы Расіі, але і з-за мяжы. Гэтая ўмова ў спалучэнні з выгадным прыродным рэльефам мясцовасці, на якой была размешчана сядзіба, і забяспечыла з'яўленне такога шэдэўра архітэктурнага і паркабудаўнічага мастацтва ў Гомелі.

**А.БАБОВІЧ,**
студэнтка 5-га курса
гісторыка-юрыдычнага факультэта.

(Працяг будзе)

## ЛЕПШЫЯ ЗНАЎЦЫ АНГЛІЙСКАЙ МОВЫ

Не сакрэт, што ў век навукова-тэхнічнага прагрэсу і пашырэння ўсемагчымых сувязей з рознымі краінамі ўсё большае значэнне набывае веданне замежных моў.

Ва універсітэце прайшла студэнцкая алімпіяда па англійскай мове з удзелам прадстаўнікоў усіх факультэтаў, прысвечаная яго 25-гадоваму юбілею. Дзякуем усім, хто прыняў у ёй удзел, і віншуем прызёраў: Андрэя Дрынова /М-32/ -- 1-е месца; Веру Кодкіну /Б-11/ -- 2-е месца, Сяргея Баброва /П-11/ -- 3-е месца.

Жадаем далейшых поспехаў у вывучэнні замежных моў!

**А.САДОЎСКАЯ,**
**С.МАКРАВУСАВА,**
выкладчыцы кафедры англійскай мовы.



12 мая на юбілейным канцэрце. Фота У.Чысціка

Спорт

## СПАРТАКІЯДА НАБЛІЖАЕЦЦА ДА ФІНІШУ

У Мінску прайшлі спаборніцтвы па плаванню ў залік рэспубліканскай спартакіяды студэнтаў.

Каманда плыўцоў нашага універсітэта, якую трэніруе старшы выкладчык Б.М.Гіль, заняла ганаровае другое месца, прапусціўшы наперад толькі каманду Акадэміі фізічнай культуры і спорту. На трэцім месцы — спартсмены БДУ.

Выпускніца факультэта фізічнай культуры, алімпійская чэмпіёнка Алена Рудкоўская лёгка перамагла на сваіх каронных дыстанцыях -- 100 і 200 м брасам. Дзве залатыя ўзнагароды і ў першакурсніцы Таццяны Царанковай на 400 і 800 м вольным стылем. Наталля Быркова выйграла фінальны заплыў на 200 м на спіне.

На рахунку нашай каманды яшчэ 6 сярэбраных узнагарод.

◆ ◆ ◆

У мінскім Палацы "Працоўныя рэзервы" прайшлі спаборніцтвы па грэка-рымскай барацьбе ў залік студэнцкай спартакіяды.

Аляксандр Канавальчык /90 кг/ заваяваў сярэбраную ўзнагароду, а Вячаслаў Каваленка /68 кг/ і Сяргей Кажамяка /100 кг/ -- бронзавыя. Тры нашых прызёры вучацца на факультэце фізічнай культуры. У агульнакамандным заліку нашы асілкі на 5-м месцы.

**В.МАРЧАНКА,**
наш спартыўны аглядальнік.

## МАЙСТРЫ КЛІНКА

"Фехтование -- есть искусство наносить удары, не получая их. Необходимость тронуть противника, избегая его ударов, делает искусство фехтования чрезвычайно сложным и трудным, ибо глазу, который видит и предупреждает, к рассудку, который обсуждает и решает, к руке, которая выполняет, необходимо прибавить точность и быстроту, дабы дать надлежащую жизнь оружию".

Гэтая фармуліроўка, дадзеная Мальерам, амаль поўнасцю словамі раскрыла фехтаванне як адзін са старажытных відаў спорту, які садзейнічае фізічнаму і гарманічнаму развіццю асобы.

Фехтаванне заўсёды было сапраўды студэнцкім відам спорту. Яно атрымала сваё прызнанне і ў нашым універсітэце. Усе 25 гадоў зборная каманда ГДУ па фехтаванню была пастаяннай удзельніцай першынстваў ВНУ Беларусі. За гэты час наша каманда 16 разоў станавілася прызёрам, а ў 1983 годзе стала пераможцай у агульнакамандным першынстве.

Геаграфія прадстаўніцтва ў зборнай камандзе па факультэтах вельмі шырокая. Студэнты ўсіх факультэтаў у розны час абаранялі гонар універсітэта на спаборніцтвах у такіх гарадах як Баку, Ленінград, Тарту, Бранск, Мінск, Навапалацк, Бабруйск, Брэст, Віцебск, Магілёў.

За 25 універсітэцкіх гадоў падрыхтавана 17 майстроў у гэтым відзе спорту. Гэта прадстаўнікі пяці факультэтаў -- матэматычнага, эканамічнага, фізічнага, фізічнай культуры і геалагічнага. Аляксандр Князькоў і Ганна Каралёва ўвайшлі ў гісторыю спартыўнай Гомельшчыны як першыя майстры спорту па фехтаванню на рапірах. В.Гофман, Н.Красуцкі, М.Рогаў і В.Грудцын, якія спецыялізаваліся па фехтаванню, сталі затым заслужанымі трэнерамі Беларусі.

А.Смірноў -- удзельнік Алімпійскіх гульняў у Барселоне, экс-чэмпіён свету ў камандных спаборніцтвах А.Барысенка, чэмпіёнка Еўропы Ж.Далгачова, пераможца першынства свету С.Коршун выбралі сваёй спартыўнай спецыялізацыяй ва універсітэце — фехтаванне. Усе яны займаюцца сучасным пяцібор'ем, дзе фехтаванне з'яўляецца адным з 5 відаў спорту. Яны на высокім узроўні абаранялі і абараняюць гонар ГДУ ў чыстым фехтаванні.

Прыемна адзначыць, што работнікі нашага універсітэта Н.Колтышава -- старшыня прафкома студэнтаў, У.Арлоў -- дэкан матэматычнага факультэта, У.Семянчук -- загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі, Г.Аляксейчанка -- нам.дэкана гісторыка-юрыдычнага факультэта, выкладчыкі В.Сычоў і В.Хімакоў у свой час таксама займаліся ў секцыі фехтавання. І хаця яны не дасягнулі вялікіх спартыўных вынікаў, але думаю, што гэты від спорту даў ім нямала.

**В.ЛІСОЎСКІ,**
старшы выкладчык кафедры фізвыхавання, майстар спорту, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады па кафедры агульнай фізікі -- дацэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней аднаго месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**Рэктарат**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

"Гомельскі універсітэт" -- газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- Цэнтральны райсавет народных дэпутатаў г. Гомеля; НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, адрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук".

Рэдактар Ул. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 279.
Падпісана да друку 20.05.94.